РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сяргей Ярук*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ДУДАРА

Вытокі беларускай інструментальнай музыкі губляюцца ў глыбіні стагоддзяў. У сістэме духоўнай культуры беларусаў ёй належыць адмысловае месца, паколькі яна, як і некаторыя іншыя складовыя фальклору, звязана з самымі рознымі сферамі народнага жыцця (працай, абрадамі, хатнім побытам, адпачынкам). Сярод народных музычных інструментаў найбольш старажытнымі з'яўляюцца духавыя. Іх група самая разнастайная: свістковыя (дудка, парныя дудкі, поршневая дудка, акарына), язычковыя (жалейка, дуда, чаротка, саломка), амбушурныя (труба, рог) інструменты. Многія з іх амаль да нядаўняга часу бытавалі сярод пастухоў, паляўнічых, музыкантаў-аматараў, а некаторыя па прычыне змянення грамадска-сацыяльных і вытворча-эканамічных умоў жыцця амаль зніклі. І толькі дзякуючы

беларускім, рускім, польскім даследчыкам духоўнай культуры беларусаў канца XIX – першай паловы XX стст. М . Нікіфароўскаму, Е. Раманаву, П. Шэйну, А. Рыпінскаму, А. Маславу, Ч. Пяткевічу многія інструменты былі рэвіталізаваны, «вернуты да жыцця» сучаснымі беларускімі майстрамі.

Сярод рэвіталізаваных інструментаў беларусаў – дуда, якой апошнім часам надаецца вялікая ўвага. Сёння вядучымі майстрамі, якія займаюцца вытворчасцю дуды з'яўляюцца: В. Кульпін, А. Лось, Т. Кашкурэвіч, А. Жура. Але цалкам праблему рэвіталізацыі ў маштабе краіны намаганнямі гэтай групы энтузіястаў-аматараў вырашыць складана, асабліва без падтрымкі з боку дзяржавы.

Дуда, валынка – старадаўні язычковы духавы народны інструмент, распаўсюджаны ў многіх краінах свету [2, с. 153]. Беларуская дуда – музычны інструмент складанай канструкцыі (мал.1), складовымі часткамі якога з'яўляюцца: скураны мех, драўляная трубка (соска), перабор (жалейка), гук (бурдон) [2, с. 153]. Знешні выгляд інструмента нагадвае гуся ці чорціка з хвастом, што звычайна выклікае смех і жарцікі. Не менш цікава выглядае і дудар са сваімі выпучанымі вачыма, надзьмутымі скіўцамі, чырвоным тварам, а таксама з вісячым з мяха «гукам» [6, с. 144–145].



*Малюнак 1* – Беларускі дудар, пач. XX ст.



*Малюнак 2* – Дудар на Купаллі, 2008 г.

Да сярэдзіны XX ст. дуда была адным з галоўных інструментаў на танцавальных вячорках беларусаў («Мяцеліца», «Барыня», «Крутуха-Лявоніха», «Кола», «Шастак», «Таўкачыкі» створаны для дуды) [6, с. 147]. Без дуды не абыходзіліся не толькі на ігрышчах, кірмашах, у корчмах, але і ў час некаторых каляндарна-земляробчых і сямейных абрадаў, асаблівую ролю дуда выконвала падчас вяселля. Цікава, што дуда (пасля свайго «вяртання») з 1990-х гг. пастаянна гучыць на спантанна наладжаных аматарамі беларусчыны Купаллях у традыцыйных і урбаністычных асяродках (мал. 2). Выканаўца на дудзе, паводле вераванняў беларусаў, лічыўся сакральнай асобай, якая валодае звышнатуральнай сілай (на ўзроўні знахароў-ваўкалакаў), здольны гукамі сваёй прылады выклікаць дождж, сонца і вецер. Вось як апісвае дудара ў сваёй працы «Даследаванне аб ваўкалаках» вядомы беларускі этнограф XIX стагоддзя П.М. Шпілеўскі: «Народ лічыць, што дудары складаюць асобную касту вышэйшых істот, якія маюць сувязь з чартаўнёй і могуць ператварыць чалавека ў пярэваратня» [1, с. 137]. Засталося нямала меркаванняў аб хітрасці выканаўцаў на дудзе, якія сустракаюцца ў таго ж П.М. Шпілеўскага: «Дудары – народ цёрты, усюды хаджалы: дудар шмат чуе, рыскае па белым свеце, шмат сам прыдумае; умее спрытна распавесці аб бачаным; часам надзьме каго-небудзь удалаю плутнёю, асабліва калі вялікая частка з суразмоўцаў яго значна падхмелена: нярэдка, дарэчы, услужыць які-небудзь старой бабе пазыкай патрэбнай рэчы» [9, с. 12–13]. Ведаючы такое вераванне беларусаў у магічную сілу дудара, ужо і самі дудары пасля некалькіх удалых ухвал свайго ўяўнага вядзьмарства, пачыналі верыць у сваё ўсёведанне, а некаторыя з іх нават вырашаліся зарабляць сваім знахарствам, нажываючы вялікае багацце, якое, праўда, звычайна было не трывалым. Беларусы сцвярджалі, што яно не сёння, дык заўтра агнём згарыць, таму што ўсе гэтыя знахары маюць справу з паскуддзем. Адна з прымавак таго часу падкрэслівае страх, які выпрабоўвалі беларусы перад асобай дудара: «Сварыся з гаспадаром, толькі не бярыся з дударом» [9, с. 13–14]. Лічылася, калі раззлуеш дудара, то можаш зрабіцца па яго літасці жабраком.

Беларускія дудары – прамыя нашчадкі архаічных сказіцеляў – некалі складалі цікавую з'яву ў вёсках. Бывалі часы, калі кожная акруга, кожнае вялікае сяло мела свайго дудара, які пад восень і потым – усю зіму – пераходзіў з хаты ў хату і спяваў пад гукі дуды народныя песні. Там, дзе ён спяваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і гуляў па вечарах, збіраліся цэлымі сем'і старых і маладых. Першыя любілі пад гукі дуды, якія зліваліся з матывамі знаёмай роднай думкі, успамінаць сваю маладосць і часта пад уплывам гэтай самабытнай музыкі заседжваюцца ў суседзяў да позняй ночы. Хлопцы і дзяўчаты завучвалі на памяць песні дудара, якія нярэдка ён сам і складаў, а потым спявалі тыя сумныя песні і цэлыя балады. Дудары заўсёды карысталіся павагай усёй акругі і нават суседніх раёнаў куды заходзілі як вандроўныя артысты. У даўніну дударамі былі звычайна старыя, якія змушана, іншы раз з-за страты голасу, абмяжоўваліся толькі гульнёй на дудзе, якая заўсёды з'яўлялася «часткай» такога музыкі. Праўда, ва ўзнагароду за страчаную магчымасць спяваць, старыя дудары, як людзі хаджалыя, забаўлялі натоўп, які збіраўся вакол іх, аповедамі аб убачаным і пачутым. Іх навіны знаёмілі жыхароў той альбо іншай вёскі з побытам суседзяў і нават іншых народаў. У гэтым выпадку яны былі сапраўднымі веснікамі для сваёй вёскі і часам даносілі да яе норавы, звычаі, паданні, павер'і, легенды і нават песні з іншых мясцовасцей. З часам на змену старым дударам прыйшлі маладзейшыя народныя песняры, якія вандравалі па розных мясцінах. Гэта, большай часткай, сіроты, якія засталіся без роду і племені, але з паэтычным самародным талентам, у якіх, іншы раз, развіваецца пісьменнасць і звычкі да ахайнасці і прывабнасці. Гэта ўжо нейкім чынам свядомыя народныя спевакі, якія перадаюць братам-сялянам свае шчырыя думкі і меркаванні аб жыцці продкаў, аб цяжкай нядолі і горы прыгоннага сялянскага жыцця, аб панах і войтах, аб гараджанах і дваранах. Гэта спрытныя апавядальнікі, вясёлыя пабрацімы на вясковых сходках, любімцы маладзіц і дзяўчат, у асяроддзі якіх яны становяцца бойкімі і з ахвотай распяваюць для іх легенды і песні [1, с. 138].

Дудары рэдка бывалі «прарокамі ў сваёй бацькаўшчыне», таму яны і з'яўляліся ў месцах далей ад родных вёсак, дзе іх мала або зусім не ведалі, дзе іх дуда не наскучыла слухачам, а хутчэй была навінкай [7, с. 6]. І разам з тым, што б ні граў дудар, ён станавіўся гаспадаром падчас якой-небудзь весялосці: песні і прыпеўкі астатніх удзельнікаў спяваліся пад тон, які давала дуда [7, с. 6]. Н.Я. Нікіфароўскі пісаў: «Нават добра не ведаючы сваёй справы «дудар» усё ж трохі найграваў танцавальных матываў, песень і таго менш, а што-небудзь «жалабоснае», ён не ў стане згуляць» [7, с. 6].

Пачынаючы з канца XIX стагоддзя дудары сустракаюцца ўсё радзей і радзей [6, с.150]. К сярэдзіне XX ст. была страчана традыцыя выкарыстання дуды ў перыяд народных ігрышчаў, абрадавых дзеянняў, знікла «этнаграфічная» дударская школа, як выканаўцаў, так і майстроў. Апошняга дудара Івана Гваздзея, па некаторых звестках, слухалі на фестывалі народнай творчасці ў Полацку ў 1951 годзе [6, с. 151], пра што было напісана ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 17 кастрычніка 1951 г. [4, с.4].

Спіс літаратуры:

1. Вашчанка, А.П. Дудар: з заходнерускіх нарысаў П.М. Шпілеўскага / А.П. Вашчанка // Полымя. – 2008.– № 11. – С. 8.
2. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1 : Сольнае выкананне. – 259 с.
3. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч.2 : Ансамблевае выкананне. – 217 с.
4. Гром, У.М. Дударэньку-гаспадэньку : рэпертуар. : зб. для аматараў ігры на дудзе. – Мінск : БелІПК, 1999. – 54 с.
5. Крамко, А.Я. Беларускія народныя духавыя інструменты: вучэбны дапаможнік./ А.Я. Крамко. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
6. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239с.
7. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии : [в 5 вып.] / Н.Я. Никифоровский. – М. : Т-во скоропечат. А.А. Левенсон, 1892–1897. – [Вып.] 2: Дудар и музыка. – 1892. – 33 с. – (Извлеч. из журн. «Этногр. обозрение». – 1892. – Кн. 13–14).
8. Скарабагатчанка, А.В. Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя : вучэб. дапам. / А.В. Скарабагатчанка. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 398 с.
9. Шпилевский, П.М. Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий / П.М.Шпилевский // Москвитянин. – 1853. – № 5.– Т. 2. Кн.1. – С. 30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ